ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
16.04.2024 № 78

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу п'ес для тэатраў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з артыкуламі 927-930 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263 «О проведении на территории Республики Беларусь отдельных централизованных культурных мероприятий» і ўстанаўлівае парадак арганізацыі і правядзення ў 2024 годзе Рэспубліканскага конкурсу п'ес для тэатраў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

захавання гістарычнай памяці аб Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне;

папулярызацыі гістарычных ведаў і супрацьдзеяння спробам скажэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

узбагачэння рэпертуару тэатраў рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання спектаклямі ваенна-патрыятычнай тэматыкі па п'есах сучасных аўтараў;

патрыятычнага выхавання грамадзян.

3. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства культуры, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», дзяржаўная ўстанова «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі"».

4. Аб'ява аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў сродках масавай інфармацыі, на афіцыйным сайце Міністэрства культуры і павінна ўтрымліваць звесткі аб месцы і тэрмінах правядзення, умовах конкурсу, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленных твораў драматургіі, парадку і тэрмінах аб'яўлення вынікаў конкурсу, а таксама іншыя звесткі, прадугледжаныя пунктам 4 артыкула 927 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

5. У конкурсе могуць прымаць удзел грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія прафесійна займаюцца літаратурнай і тэатральнай

творчасцю і творчай працай якіх створана п'еса (далей – аўтары (аўтарскія калектывы).

6. П'есы, якія падаюцца аўтарамі (аўтарскімі калектывамі) да ўдзелу ў конкурсе, павінны быць арыгінальнымі творамі драматургіі на беларускай або рускай мовах, напісанымі не раней 2015 года, якія раней не мелі сцэнічнага ўвасаблення, і быць прыдатнымі для пастаноўкі ў драматычных тэатрах.

Адзін аўтар (аўтарскі калектыў) можа падаць на конкурс не больш за дзве п'есы.

7. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі п'ес з'яўляюцца:

высокі мастацкі ўзровень;

наяўнасць арыгінальных творчых ідэй, якія садзейнічаюць развіццю і папулярызацыі нацыянальнага тэатральнага мастацтва;

адпаведнасць тэмам конкурсу.

8. Конкурс праводзіцца па наступных тэмах:

«Голас Памяці. Прафесіі Перамогі»;

«Голас Памяці. Вызваленне»;

«Голас Памяці. Свету мір»;

«80 гадоў Перамогі».

9. Для ўдзелу ў конкурсе ў перыяд з 15 красавіка па 1 верасня 2024 г. удзельнікі падаюць на электронны адрас: info@rtbd.by наступныя матэрыялы:

заяўку на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам;

тэкст п'есы;

інфармацыю аб аўтарах (аўтарскіх калектывах) з указаннем біяграфічных звестак і творчых дасягненняў.

10. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктам 6 і 9 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

11. Для падвядзення вынікаў конкурсу і вызначэння пераможцаў конкурсу фарміруецца журы конкурсу.

У склад журы могуць уваходзіць кіраўнікі і творчыя работнікі тэатраў, пісьменнікі, навуковыя работнікі, супрацоўнікі музеяў, тэатразнаўцы, іншыя работнікі культуры, а таксама прадстаўнікі Міністэрства культуры.

Персанальны склад журы вызначаецца Міністэрствам культуры.

У склад журы не могуць уваходзіць асобы, якія з'яўляюцца аўтарамі (сааўтарамі) п'ес, вылучаных для ўдзелу ў конкурсе.

12. Па выніках работы журы ў перыяд з 2 верасня па 2 кастрычніка 2024 г. вызначае не больш за 7 аўтараў (аўтарскіх калектываў) – пераможцаў конкурсу.

13. Рашэнне журы прымаецца шляхам адкрытага або тайнага галасавання простай большасцю галасоў. Парадак галасавання вызначаюць члены журы на пачатку пасяджэння. Рашэнне журы лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці іх агульнага складу. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня журы.

Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца старшынёй і сакратарам журы. Рашэнне журы лічыцца канчатковым, перагляду не падлягае.

Аўтары (аўтарскія калектывы) – пераможцы конкурсу абвяшчаюцца аб выніках конкурсу індывідуальна.

14. Аўтары (аўтарскія калектывы) – пераможцы конкурсу атрымліваюць грашовую прэмію ў памеры 60 базавых велічынь. У выпадку, калі пераможцам стаў аўтарскі калектыў, грашовая прэмія дзеліцца паміж усімі ўдзельнікамі калектыву ў роўных долях. Памер базавай велічыні вызначаецца на дзень выплаты прэміі.

Грашовая прэмія пералічваецца на разліковы рахунак аўтара (аўтарскага калектыва), які (якія) сталі пераможцамі.

15. П’есы аўтараў (аўтарскіх калектываў), якія сталі пераможцамі конкурсу, перадаюцца Міністэрствам культуры ў тэатральна-відовішчныя ўстановы рэспубліканскага і мясцовага падпарадкавання для пастаноўкі спектакляў у 2024 – 2025 годзе.

16. Фінансаванне выдаткаў на выплату грашовых прэмій ажыццяўляецца за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021 – 2025 гады (падпраграмма 2 «Мастацтва і творчасць»), зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 студзеня 2021 г. № 53, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення рэспубліканскага конкурсу п’ес для тэатраў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў 2024 годзе

Заяўка
на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе п’ес для тэатраў, прысвечаных 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў 2024 годзе

Прозвішча, імя, імя па бацьку, грамадзянства, дата, месяц год нараджэння аўтара (кожнага з удзльнікаў калектыва аўтараў)________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Назва п’есы_____________________________________________________

Год стварэння п’есы ______

Кароткая інфармацыя аб п’есе (жанр, анатацыя)

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

Пералік прыкладзеных да заяўкі матэрыялаў

_________________________________________________________________

Я (мы) (прозвішча, імя, імя па бацьку) пацвярджаю (-ім), што валодаю (-ім) аўтарскімі правамі на п’есу, якая падаецца на ўдзел у конкурсе. У выпадку ўзнікнення спрэчных пытанняў, звязаных з аўтарскімі правамі на п’есу, з трэцімі асобамі, абавязуюся (-емся) вырашаць гэтыя пытанні самастойна.

Удзельнік (кі)

___________________ ______________________________

(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)